СТУДЗЕНЬ - ЧЭРВЕНЬ 2023

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

Звычайна БХК выкарыстоўвае праваабаронча-валошкавы колер у дызайне сваіх публікацый. Але на гэты раз мы абралі колер viva magenta.

Па версіі інстытута колеру Pantone гэта колер 2023 года. Прадстаўнікі Інстытута апісваюць гэты колер як смелы, дасціпны і ўсёабдымны; колер, які вітае кожнага з імкненнем да жыцця.

БХК выкарыстоўвае гэты колер, каб паспрабаваць вярнуць увагу свету да Беларусі, нагадаць, што мы — частка глабальнага працэсу, і бяспека нашай краіны ўплывае на бяспеку ўсяго рэгіёна.

Акрамя таго, viva magenta — гэта ўсё яшчэ варыянт чырвонага колеру. Ён дадаткова сігналізуе, што ў той час, як усе прытаміліся ад тэмы Беларусі, сітуацыя з правамі чалавека тут крытычна пагаршаецца.

БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ

© Беларускі Хельсінкскі Камітэт, 2023

# ЗМЕСТ


**УВОДЗІНЫ** 5

**РЭЗЮМЭ** 7

**I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ** 9

Фармалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі і ўзмацненне дзяржаўнай прапаганды 9

Сістэмная кампанія па рэфрэймінгу генацыду як маніпуляцыя ў рамках палітыкі памяці 12

Увядзенне суб’ектнага падыходу да вызначэння крыніцаў пагроз нацыянальнай бяспецы: фармалізацыя пошуку «ворагаў народу» 13

Значнае пашырэнне легалізацыі рэпрэсій у дачыненні да палітычных апанентаў і любых іншадумцаў 14

«Нацыяналізацыя» грамадзянскай супольнасці 16

Узмацненне мілітарызацыі 16

«Праца» з беларусамі, што з’ехалі пасля 2020 г.: маніпуляцыя вяртаннем 18

Ужыванне грамадзянскімі інстытуцыямі супрацьпраўных практык сілавых структур і іншых неўласцівых практык 19

Палітыка па фармалізацыі дыскрымінацыі па прыкметах сэксуальнай арентацыі, гендэрнай ідэнтычнасці і рэпрадуктыўнага выбару 20

Новыя правілы ўступнай кампаніі: патрабаванні да абітурыентаў, якія ствараюць перадумовы для дыскрымінацыі 21

Агульны адыход ад фармальнай роўнасці 22

**II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННЕ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ** 24

Узмацненне праверак на межах 24

Узмацненне кантролю за вайскоўаабавязаннымі 25

Пераслед за фінансавыя ахвяраванні ў фонды, якія дапамагаюць пацярпелым ад рэпрэсій 25

Масавае парушэнне правоў дзяцей сілавымі органамі 26

*Incommunicado* ў дачыненні да палітвязняў 27

Першы (публічна вядомы) прамы крымінальны пераслед адваката за аказанне прававой дапамогі сваім кліентам 28

Першыя прысуды *in absentia* (завочныя суды) 28

Першы прысуд за «беларускі нацыяналізм» 29

Узмацненне прапаганды вайны і індактрынацыі расійскімі наратывамі ў галіне адукацыі 29

**III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ДАТЫЧАЦЬ СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ** 31

Прызнанне здзяйснення ўладамі Беларусі злачынстваў супраць чалавечнасці напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 г. і пасля іх 31

Паўторны запуск Маскоўскага механізму АБСЕ ў дачыненні да сітуацыі з Беларуссю 32

Прызнанне сітуацыі з палітычнай эміграцыяй беларусаў пасля падзеяў 2020 г. яўнай, бачнай праблемай на рэгіянальным узроўні, якая патрабуе скансалідаваных дзеянняў еўрапейскіх дзяржаваў 32

Прыняццё МАП канкрэтных рэкамендацый па мерах у дачыненні да Беларусі ў рамках прымянення арт. 33 Статута МАП 33

Прызнанне на ўзроўні ЕС і Савета Еўропы неабходнасці прыцягнення да індывідуальнай крымінальнай адказнасці у сувязі з вайной ва Украіне Лукашэнкі і іншых вышэйшых службовых асобаў Беларусі 34

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мантат Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека, які рэгулярна прадстаўляе свае даклады.[1] Агляды па сітуацыі прадстаўляюцца таксама ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў.[2] У сувязі з неабгрунтаваным прымяненнем сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўнікаў супраць фальсіфікацыі выбараў у 2020 г. і рэпрэсіямі, якія распачаліся пасля гэтага, пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН у сакавіку 2021 г. быў закладзены спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі.[3]

З 2019 года БХК разлічвае **Нацыянальны індэкс па правах чалавека**, у рамках якога больш за 50 беларускіх экспертаў ацэньваюць змены асобна па кожным праве каталога правоў чалавека. Беларускія НДА робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, сыходзячы са сваёй спецыялізацыі[4].

Спачатку падзеі 2020 г., пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі сітуацыю ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў галіне правоў чалавека. Сітуацыя пастаянна пагаршаецца: штодня паведамляецца аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў,[5] канкрэтных парушэннях і т.п. У гэтай плыні інфармацыі **цяжка ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значных падзеяў, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы лічым важным адсочваць найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне правоў чалавека.

Дзеля гэтага з ліпеня 2023 г. Беларускі Хельсінкскі Камітэт будзе выпускаць перыядычны агляд. Ён закліканы не дубляваць наяўныя маніторынгі і даклады і не з'яўляецца маніторынгам парушэння правоў чалавека за канкрэтны перыяд. Яго мэта – раз у паўгоддзе прадстаўляць нашыя экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных зменаў у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** ў галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці па трох кірунках:

---

1 *https://www.ohchr.org/ru/special-procedures/sr-belarus*

2 *https://www.ohchr.org/ru/countries/belarus*

3 *https://www.ohchr.org/ru/hr-bodies/hrc/ohchr-belarus/index*

4 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, якія рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications; Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацый грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring; Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.by/ru/analytics/44 и др.*

5 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры*: сістэмныя рэчы — заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;
- *правапрымяняльная практыка*: тэндэнцыі парушэння грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;
- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур*, звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Наша аналітыка дапаможа лепей зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў – у прынцыпе лепей арыентавацца ў беларускай рэчаіснасці), дасць магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць правачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), будзе карысная для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Агляд будзе выходзіць, як правіла, двойчы на год (за перыяд са студзеня па ліпень і з ліпеня па снежань).

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА TRENDS.BELHELCOM.ORG

# РЭЗЮМЭ

Асноўны трэнд на ўзроўні агульнай палітыкі, які можна канстатаваць у першым паўгоддзі 2023 г., — істотнае пашырэнне **фармалізацыі (легалізацыі) незаконных дзеянняў дзяржавы**.

Можна гаварыць аб руху дзяржавы да **фармалізацыі дыскрымінацыі і адыходзе ад фармальнага прынцыпа роўнасці**. Калі раней няроўнае абыходжанне, як правіла, было вынікам выбарнага тлумачэння і прымянення закона (фактычная дыскрымінацыя), то цяпер можна канстатаваць, что дзяржава заканадаўча ў розных сферах пачала дзяліць людзей «на розныя гатункі» па прыкмеце лаяльнасці дзяржаве.

**Значна пашырылася легалізацыя рэпрэсій**. На заканадаўчым узроўні ў шматлікіх сферах замацоўваюцца абгрунтаванні для адвольнага абмежавання правоў чалавека. Перагляд Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і **ўвядзенне панятку «суб’ект, які прадукуе фактары пагрозы»** фармалізуе і максімальна пашырае пошук «ворагаў дзяржавы». Прычым факт любой сувязі з замежнай дзяржавай становіцца падставай для асаблівай увагі да чалавека і робіць яго патэнцыйным «ворагам».

Адбылася **«нацыяналізацыя» грамадзянскай супольнасці** на заканадаўчым узроўні: дзяржава фармальна замацавала за сабой права «прызначаць» арганізацыі, якія будуць складаць грамадзянскую супольнасць.

Са жніўня 2020 г. дзяржава зняла большасць прававых і маральных абмежаванняў для сілавікоў і часткі дзяржслужбоўцаў. Цяпер можна сказаць, што праяўляюцца аддаленыя вынікі гэтых дзеянняў. Адбываецца паступовае **«разбэшчванне» грамадства беспакаранасцю**. У прыватнасці, грамадзянскія інстытуты пераймаюць супрацьпраўныя практыкі сілавых структур і іншыя неўласцівыя практыкі. Вельмі характэрна, што гэта пачало праяўляцца са сферы адукацыі.

Пры гэтым, **прапаганда (у тым ліку ваенная) ўзмацняецца** і на ўзроўні агульных мераў, і на ўзроўні правапрымяняльнай практыкі. Гэта праяўляецца і ў актыўнай фармалізацыі дзяржаўнай ідэалогіі, і ва ўмацненні ваеннай прапаганды ва ўстановах адукацыі (асабліва сярод школьнікаў).

Назіраецца **ўзмацненне расійскага ўплыву і наратываў** як на ўзроўні агульных мераў, так і на ўзроўні практыкі: пераняццё заканадаўчай практыкі адносна дыскрэдытацыі арміі, змена палітыкі ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці; ініцыятывы па выпрацоўцы сумесных падыходаў да выкладання гісторыі; непасрэдны ўдзел расійскай амбасады ў прапагандзе, скіраванай на студэнтаў ваенных і сілавых ВНУ; нармалізацыя ваенных злачынстваў, прадстаўленне героямі расійскіх прапагандыстаў.

Узмацняюцца меры па **дыскрэдытацыі іншай сістэмы каштоўнасцяў**. Тут два кірункі: актыўная фармалізацыя «антызаходніцтва» і ўзмацненне дыскрэдытацыі беларускага нацыянальнага кампанента (сімволікі, структур, герояў, гістарычных падзей і ў цэлым нацыянальнай барацьбы).

Таксама ў справаздачным перыядзе праявілася прызнанне ўладамі маштабнасці праблемы з масавай эміграцыяй пасля 2020 г. і пачаліся **маніпуляцыі вяртаннем на сістэмным узроўні**. Прычым у форме, якая дазваляе абгрунтаванні для адвольнага пераследу чалавека, парушае шэраг правоў чалавека і прыніжае ягоную годнасць.

Узмацняецца мілітарызацыя і, як наступства, кантроль за ваеннаабавязанымі. Узмацняецца ў прынцыпе кантроль за чалавекам і **пашыраюцца формы адвольнага ўмяшання дзяржавы ў асабістае жыццё чалавека**: узмацненне ўвагі да людзей, якія маюць від на жыхарства ў іншай дзяржаве, намер узмацніць кантроль у дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці і чайлдфры, пераслед за фінансавыя ахвяраванні ў фонды, якія дапамагаюць пацярпелым ад рэпрэсій, новыя правілы ўступнай кампаніі (патрабаванне абавязковай характарыстыкі з пазіцыямі, якія адлюстроўваюць лаяльнасць да дзяржавы), масавае парушэнне правоў дзяцей у сувязі з належнасцю да пэўнай субкультуры (ПВК «Рэдан»).

У касці важных трэндаў першага паўгоддзя 2023 г. у правапрымяняльнай практыцы таксама можна адзначыць прымяненне рэжыма *incommunicado* (пазбаўленне камунікацыі) ў дачыненні да шэрагу публічных палітзняволеных, першы (публічна вядомы) непрыкрыты крымінальны пераслед за аказанне прававой дапамогі сваім кліентам, першыя прысуды *in absentia* (завочныя суды), першы прысуд за «беларускі нацыяналізм».

Калі гаварыць аб зменах у рэакцыях міжнародных структур, якія тычацца сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, то найбольш значнымі з іх былі: прызнанне на ўзроўні ААН здзяйснення ўладамі Беларусі злачынстваў супраць чалавечнасці напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 г. і пасля іх; паўторны запуск Маскоўскага механізма АБСЕ ў дачыненні да сітуацыі з Беларуссю; прызнанне на ўзроўні Савета Еўропы сітуацыі з палітычнай эміграцыяй беларусаў пасля падзеяў 2020 г. яўнай, бачнай праблемай; прыняццё МАП канкрэтных рэкамендацый па мерах у дачыненні Беларусі ў рамках прыцягнення да індывідуальнай крымінальнай адказнасці ў сувязі з вайной ва Ўкраіне Лукашэнкі і іншых вышэйшых асобаў Беларусі.

# І. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- істотна пашырылася легалізацыя рэпрэсій. На нарматыўным узроўні дадалося валюнтарысцкіх абгрунтаванняў для абмежавання правоў чалавека і магчымасці адвольна прымяняць паняцці ў інтарэсах «нацыянальнай бяспекі», «грамадскай неабходнасці», «пагрозы нацыянальнай бяспецы», «шкоды нацыянальным інтарэсам». Усяго за першае паўгоддзе 2023 г. з гэтай мэтай былі зменены як мінімум 5 нарматыўных актаў;
- адбываецца адыход ад фармальнай роўнасці. Дзяржава перастала «саромецца» і ад практыкі фактычнай няроўнасці пераходзіць да актыўнага заканадаўчага замацавання падзелу людзей на «правільных» і «няправільных» па прыкмеце лаяльнасці дзяржаве, а таксама ў залежнасці ад «карыснасці» для дзяржавы;
- узмацняецца фармалізацыя ідэалогіі. Дзяржава афіцыйна замацавала прыярытэт дзяржаўных інтарэсаў над інтарэсамі чалавека і падвяла ідэалагічны грунт пад беззаконне.

## ФАРМАЛІЗАЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ІДЭАЛОГІІ І ЎЗМАЦНЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРАПАГАНДЫ

Са студзеня 2023 г. адбываецца **актыўная фармалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі ў розных сферах, формах і на розных узроўнях**. Практычна ўсе наратывы самі па сабе не новыя, але відавочна, што з 2023 г. дзяржава імкнецца іх максімальна фармалізаваць, рыхтуючы глебу для ўзмацнення розных формаў дзяржаўнай

прапаганды. Гэта непазбежна будзе прыводзіць да яшчэ больш сістэмных парушэнняў, у першую чаргу, свабоды выражэння думак, права на доступ да інфармацыі, права на адукацыю, пераслед за іншадумства ў розных формах, дыскрымінацыі.

У студзені 2023 г. ў Мінску адбыўся семінар «Рэспубліка Беларусь: ад вытокаў да сучаснасці», арганізаваны Саветам Рэспублікі Нацыянальнага Сходу, па выніках якога была прынятая рэзалюцыя.[6] Яе палажэнні і асноўныя тэзісы можна лічыць «афіцыйным» светапоглядам на бліжэйшую будучыню для ўсіх грамадскіх інстытуцый: у працу семінара былі ўключаныя прадстаўнікі навукі, адукацыі, сілавых органаў, СМІ, царквы, прадзяржаўных грамадскіх арганізацый, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, культуры, спорту і турызму.

Асноўныя наратывы рэзалюцыі: **гістарычныя** (з націскам на СССР як асноўны арыентыр); **нацыянальныя** (дэкларуецца важнасць беларускай мовы і культуры, пры гэтым адмаўляюцца «любыя формы этнічнага і культурнага нацыяналізмау»); грамадска-палічныя (з націскам на асаблівую ўласцівую беларусам «дзяржаўна-прававую ідэнтычнасць», і формы кіравання ды самакіравання, «якія адпавядаюць светапогляду і менталітэту беларусаў»).

Вельмі значным крокам у фармалізацыі ідэалогіі стала прыняццё ў канцы чэрвеня новага дакументу — **Канцэпцыі прававой палітыкі**.[7] З аднаго боку – гэта частка фармалізацыі даўно складзенага становішча рэчаў. З іншага, цікава і паказальна тое, што гэта першая спроба замацаваць фундаментальныя, вызначальныя рэчы для прававой палітыкі пасля 1992 г., калі адразу за прыняццём Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, была прынятая Канцэпцыя судова-прававой рэформы (зацверджаная Пастановай Вярхоўнага Савету №1611-XII). Яе дзеянне было спыненае ў пачатку 2000-х. Пасля гэтага прымалася толькі дастаткова «тэхнічная» Канцэпцыя ўдасканальвання заканадаўства. Да пытання вызначэння канцэптуальных асноваў права ў грамадстве беларускія ўлады вярнуліся толькі пасля рэферэндума 2022 г. У сакавіку 2022 г. Канстытуцыйны суд у сваім штогадовым пасланні аб стане канстытуцыйнай законнасці нагадаў пра неабходнасць стварэння такой канцэпцыі.[8]

Канцэпцыяй уводзяцца зусім новае паняцце — **«гісторыка-ідэалагічныя асновы і ідэалагічныя імператывы прававой палітыкі»**. Якія, па-сутнасці, заключаюцца ў тым, што, па-першае, абгрунтоўваюць неабходнасць ставіць інтарэсы дзяржавы

6 *https://zviazda.by/ru/news/20230125/1674647311-respublika-belarus-ot-istokov-do-sovremennosti*
7 *https://president.gov.by/ru/documents/ukaz-no-196-ot-28-iyunya-2023-g*
8 *http://www.kc.gov.by/document-74183*

вышэй за асабістыя (менавіта так вызначаецца ў Канцэпцыі патрыятызм); а па-другое, абгрунтоўвюць, чаму ўсе прававыя нормы і стандарты, якія функцыянуюць у дэмакратычных супольнасцях (якія там таксама утрымліваюцца ў вялікай колькасці) для беларускага народа павінны прымяняцца з папраўкай на спецыфіку ягонага (народу) шляху. Прасцей кажучы, **з'явілася ідэалагічная аснова беззаконня**.

За паўгода, ад студзеня да чэрвеня 2023 г., было выдадзена **4 новыя тэматычныя «метадычкі»**[9] **для адзіных дзён інфармавання**[10], якія клалі асаблівы націск на асноўныя трэнды прапаганды і транслявалі ў больш разгорнутым выглядзе наратывы вышэйзгаданай рэзалюцыі: першая прысвечаная арміі і ваеннай бяспецы,[11] **другая** — вынікам штогадовага паслання Лукашэнкі 31 сакавіка 2023 г.,[12] **трэцяя** — вынікам расследавання генацыда беларускага народа,[13] **чацвертая** — «правільнай пазіцыі па гісторыі Другой сусветнай вайны.[14]

Набірае абароты палітыка **індакрынацыі**,  у т.л. **савецкімі і расійскімі наратывамі ў сферы адукацыі**.

**Па-першае**, у пачатку студзеня міністр адукацыі заявіў аб рэалізацыі «канцэпцыі «Школа-музей», што азначае, што за гэты год **у кожнай беларускай школе** павінен з'явіцца або музей, або асобная экспазіцыя аб беларускай дзяржаўнасці.[15]

**Па-другое**, у лютым кіраўнік адміністрацыі Лукашэнкі І. Сяргеенка на паседжанні Рэспубліканскага Савету па гістарычнай палітыцы на базе НАН заявіў пра тое, што педагогі ў рэгіёнах нібыта падымаюць пытанне аб недахопе дакументальных фільмаў гістарычнай тэматыкі для дэманстрацыі школьнікам і **прапануюць дэманстраваць у шосты школьны дзень мастацкія і дакументальныя савецкія фільмы**.[16] Што сведчыць пра намер яшчэ большай індактрынацыі менавіта савецкімі наратывамі і ўстаноўкамі.

**Па-трэцяе**, напрыканцы чэрвеня на X Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі была агучаная і замацаваная ў выніковым дакуменце ініцыятыва Савета Федэрацыі і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па распрацоўцы адзіных падыходаў да выкладання гісторыі («агульны навукова абгрунтаваны гістарычны стандарт, які ўтрымлівае канцэптуальныя ацэнкі гістарычных падзей і асобаў»).[17]

---

9 *Падрыхтаваныя Акадэміяй кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Афіцыйна яны называюцца «матэрыялы для членаў інфармацыйна-прапагандыскіх груп».*

10 *Абавязковыя інфармацыйныя мерапрыемствы ва ўсіх дзяржаўных установах і арганізацыях.*

11 *https://minsk.gov.by/ru/actual/view/209/2023/inf_material_2023_02.shtml*

12 *https://minsk.gov.by/ru/actual/view/209/2023/inf_material_2023_04.shtml*

13 *https://minsk.gov.by/ru/actual/view/209/2023/inf_material_2023_03.shtml*

14 *https://minsk.gov.by/ru/actual/view/209/2023/inf_material_2023_05.shtml*

15 *https://news.zerkalo.io/life/29831.html?c*

16 *https://www.belta.by/society/view/sergeenko-est-zapros-na-sozdanie-novyh-dokumentalnyh-filmov-i-peredach-istoricheskoj-tematiki-547727-2023/*

17 *https://tass.ru/obschestvo/18145203*

У траўні 2023 г. дзяржаўная кінастудыя Беларусьфільм прэзентавала **трэйлэр новага мастацкага фільма «На другім беразе»** аб сярэдзіне 1920-х, часе, калі Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польшчы. У дзяржаўных СМІ фільм назвалі народным і *лёсаносным аб барацьбе «глыбіннага народу» з панскай Польшчай*. Прэм'ера запланаваная на 17 верасня 2023 г. [18]

## СІСТЭМНАЯ КАМПАНІЯ ПА РЭФРЭЙМІНГУ[19] ГЕНАЦЫДУ ЯК МАНІПУЛЯЦЫЯ Ў РАМКАХ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ

Рэфрэймінг генацыду варта выдзяліць у асобны трэд, бо апрача стварэння ўмоваў для парушэння вышэйзгаданых правоў чаславека, у такіх маніпуляцый ёсць асаблівая мэта ў рамках рэпрэсіўнай палітыкі – дыскрэдытаваць іншую сістэму каштоўнасцяў, якой прытрымліваюцца нязгодныя, і саміх нязгодных.

Размова ідзе адначасова пра «заходнія» каштоўнасці і пра дыскрэдытацыю нацыянальнага кампанента, які ўклаў вялікі унёсак у мірны пратэст (сімвалаў, структур, герояў, нацыянальнай барацьбы ў цэлым). Прычым размова ідзе не проста аб дыскрэдытацыі, але і пра атаесамліванне з самай непрымальнай з'явай з пункту гледжання традыцыйнага ўспрымання беларускага грамадства – з дзеяннямі нацыстаў на тэрыторыі Беларусі падчас Другой сусветнай вайны.

Менавіта такую мэту пераследуе вялікая дзяржаўная кампанія па рэфрэймінгу генацыду, якая пачалася ў 2021 г.,[20] актыўна працягвалася ў 2022,[21] а ў першай палове 2023 г. перайшла на якасна новы ўзровень. У траўні 2023 г. прынятыя змены ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс, у адпаведнасці з якімі можна будзе ўзбуджаць крымінальныя справы па пэўных складах (у тым ліку па генацыдзе) ў дачыненні да памерлых. Каментуючы гэтыя змены, прадстаўнікі дзяржавы наўпрост заяўляюць што «сёння, у гэты няпросты час, з улікам змены рэалій важна зрабіць усё магчымае для захавання гістарычнай памяці і праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны».[22]

---

18 *https://www.youtube.com/watch?v=VVHCnKQXksA*

19 *Тут і далей «рэфрэймінг» (ад англ. frame-рамка) — па-новаму сфармуляваць сутнасць, укласці новыя сэнсы.*

20 *Была адкрытая крымінальная справа аб генацыдзе беларускага народу: https://www.prokuratura.gov.by/ru/activity/rassledovanie-ugolovnogo-dela-o-genotside/*

21 *Была напісаная (невядомымі аўтарамі) кніга «Генацыд беларускага народу» пад рэдакцыяй Генеральнага пракурора А.Шведа: https://belkniga.by/bel/catalog/ne_prostavlena_gruppa/genotsid-belorusskogo-naroda-z-439/; Генеральная пракуратура зрабіла 8 праектаў з дзяржаўнымі СМІ (пераважна цыклы дакументальных фільмаў), практычна ў кожным з якіх праводзяцца паралелі паміж дзеяннямі нацыстаў падчас Другой сусветнай вайны і пратэстамі 2020 года. Тры з іх проста ў назве праводзяць паралель з Германіяй, Украінай і Польшчай: https://www.prokuratura.gov.by/ru/activity/rassledovanie-ugolovnogo-dela-o-genotside/proekty-so-sredstvami-massovoy-informatsii/*

22 *http://house.gov.by/ru/interview-ru/view/vse-vinovnye-v-genotside-dolzhny-byt-izoblicheny-deputaty-prinjali-izmenenija-v-ugolovno-protsessualnyj-kodeks-10355/*

У вышэйзгаданых прапагандысцкіх матэрыялах аб расследаванні генацыду асабліва адзначаецца, што разам з немцамі ў генацыдзе беларусаў удзельнічалі літоўскія, польскія, украінскія і іншыя нацыяналісты, а таксама «еўрапейскія саюзнікі». Асабліва падкрэсліваецца роля «беларускіх калабарыцыяністаў» і той факт, што яны насілі бчб-сімволіку і герб «Пагоня» на сваёй уніформе. [23]

## УВЯДЗЕННЕ СУБ'ЕКТНАГА ПАДЫХОДУ ДА ВЫЗНАЧЭННЯ КРЫНІЦЫ ПАГРОЗ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕЦЫ: ФАРМАЛІЗАЦЫЯ ПОШУКУ «ВОРАГАЎ НАРОДУ»

У сакавіку 2023 г. Саветам бяспекі Беларусі быў ухвалены праект новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі.[24] У параўнанні з папярэдняй (2010 г.) у праекце новай Канцэпцыі, апрача ўзмоцненых прапагандысцкіх наратываў, з'явіўся шэраг зменаў, якія яшчэ болей спрашчаюць адвольнае прымяненне і маніпуляцыю такім абгрунтаваннем для абмежавання правоў чалавека, як «ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі».

**Па-першае, з'явіліся новыя паняткі**: «выклік нацыянальнай бяспецы» (аб'ектыўна фармаваная небяспека прычынення шкоды нацыянальным інтарэсам), «рызыка для нацыянальнай бяспекі» (зараджэнне небяспекі прычынення шкоды нацыянальным інтарэсам), «электаральны суверэнітэт» (неад'емнае і выключнае права дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары).

**Па-другое**, што самае галоўнае, **змяніўся падыход да вызначэння крыніцаў пагроз нацыянальнай бяспекі**, ён стаў суб'ектным. Калі ў Канцэпцыі 2010 г. такой крыніцай лічыліся «фактар ці сукупнасць фактараў», то ў новай канцэпцыі да крыніцаў пагроз нацыянальнай бяспекі адносяцца «фактар ці сукупнасць фактараў», а таксама **«суб'ектаў, што іх прадукуюць»**. Прадстаўнік Генштаба Ўзброеных сіл, каментуючы ў дзяржаўных СМІ, наўпрост акцэнтуе ўвагу на тым, што новая канцэпцыя дазволіць ім рэагаваць яшчэ на стадыі зараджэння пагрозы, а не паводле факту яе ўзнікнення, пры гэтым да суб'ектаў-крыніцаў пагрозы адносяцца «здраднікі і сабатажнікі».[25] Відавочна, размова вядзецца пра грамадзянаў Беларусі з пазіцыяй, якая ідзе ўразрэз з дзяржаўнай, прычым незалежна ад іх месцазнаходжання (ў Беларусі ці за яе межамі).

23 *https://minsk.gov.by/ru/actual/view/209/2023/inf_material_2023_03.shtml*
24 *https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P223s0001*
25 *https://news.zerkalo.io/economics/33454.html?c»*

# ЗНАЧНАЕ ПАШЫРЭННЕ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ РЭПРЭСІЙ У ДАЧЫНЕННІ ДА ПАЛІТЫЧНЫХ АПАНЕНТАЎ І ЛЮБЫХ ІНШАДУМЦАЎ

Адразу ў некалькіх галінах фармалізаваныя нормы, якія дазваляюць адвольна трактаваць панаткі «грамадская неабходнасць», «пагроза нацыянальнай бяспецы», «шкода нацыянальным інтарэсам», і да т.п. Палажэнні законаў маюць выразна рэпрэсіўны характар і відавочна прынятыя ў якасці «адказных мераў» і інструмента барацьбы з палітычнымі апанентамі, у прынцыпе любымі іншадумцамі і «калектыўным захадам» (што тычыцца адбірання ўласнасці і паведамлення ўладам аб наяўнасці замежнага віду на жыхарства), а таксама для застрашвання дзяржаўных службоўцаў і вайскоўцаў.

**Па-першае**,  на пачатку году быў прыняты закон «Аб адабранні маёмасці»[26], які **парушае шэраг канстытуцыйных правоў (у першую чаргу, права на недатыкальнасць уласнасці).** Ён прадугледжвае адабранне маёмасці практычна ў любых юрыдычных ці фізічных асоб (як беларускіх, так і замежных), на вельмі «размытых» і валюнтарысцкіх падставах: «непрыязныя дзеянні ў дачыненні да Беларусі», залежнасць ад рашэнняў «непрыязных дзяржаў», пералічаных у рэестры Саўміна.

Пры гэтым, такое адабранне маёмасці нават не з'яўляецца канфіскацыяй, бо не адпавядае патрабаванням канфіскацыі (змены, унесеныя ў ГК, унесеныя ў іншы артыкул, а не ў артыкул аб канфіскацыі). Таксама важна заўважыць, што рашэнне аб такім адабранні прымае Саўмін, і толькі потым Дзяржаўны камітэт па маёмасці звяртаецца ў эканамічны суд г. Мінска з заявай аб адабранні аб'ектаў права ўласнасці. Характэрна тое, што рашэнне суда аб адабранні маёмасці падлягае неадкладнаму выкананню, г.зн. да ягонага ўступлення ў сілу.

**Па-другое**, тады ж, у пачатку студзеня, былі ўнесеныя чарговыя змены ў Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусі»: цяпер прадугледжаная **магчымасць пазбаўлення беларускага грамадзянства, набытага паводле нараджэння** для тых, хто знаходзіцца за мяжой і прызнаныя беларускім судом эстрэмістамі ці тымі, хто прычыніў шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі. Апрача таго, грамадзяне Беларусі цяпер абавязаныя паведамляць кампетэнтным органам аб наяўнасці ў іх віду на жыхарства іншай дзяржавы ці іншага падобнага дакументу.[27]  Гэтая мера, разам з суб'ектным падыходам у новай рэдакцыі Канцэпцыі нацыянальнай

---

[26] *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300240&p1=1&p5=0*
[27] *https://pravo.by/novosti/obshchestvenno-politicheskie-i-v-oblasti-prava/2023/january/72724/*

бяспекі, канцэпцыяй «непрыязных краін» і т.п., фактычна вядзе да таго, што **любая сувязь з замежнай дзяржавай**, і тым больш, пражыванне за мяжой (у першую чаргу размова ідзе, натуральна, аб заходніх краінах) ужо робіць грамадзянаў Беларусі **падазронымі для дзяржавы** і патэнцыйнымі ворагамі, якія павінны быць «на асаблівым кантролі».

**Па-трэцяе**, у траўні ўнесеныя папраўкі ў закон «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзянаў Рэспублікі Беларусь», палажэнні якога парушаюць **права на свабоду перасоўвання беларускіх грамадзянаў**.[28] Змены надаюць КДБ паўнамоцтвы абмяжоўваць на тэрмін да паўгода выезд тым, чый выезд супарэчыць інтарэсам нацыянальнай бсяспекі Рэспублікі Беларусь. Апрача таго, забарона можа датычыць тых, у дачыненні да каго вядзецца адміністратыўная справа, але яшчэ няма рашэння суда (што таксама супрацьпраўна). Асаблівыя ўмовы выезда цяпер у вышэйшых службовых асобаў сілавых структур (неабходнсьць узгаднення выезду з Лукашэнкам), а таксама у вайсковаслужбоўцаў, супрацоўнікаў, работнікаў і грамадзянскага персаналу ваенных і ваенізаваных арганізацый.

**Па-чацвертае**, у траўні ўнесеныя змены ў КК, якія яшчэ больш спрасцілі **адвольны крымінальны пераслед за «злачынствы антыдзяржаўнай скіраванасці»**.[29] Да якасных зменаў можна аднесці дзве асноўныя навелы: **уведзеная крымінальная адказнасць за дыскрэдытацыю Ўзброеных Сілаў**, іншых войскаў і войсковых фармаванняў, (такога палажэння не было ў беларускім крымінальным заканадаўстве, гэта расійская практыка); у дачыненні да чыноўнікаў уведзенае яшчэ адно палажэнне, відавочна, скіраванае на іх застрашванне – **уводзіцца магчымасць прымянення смяротнай кары за здраду дзяржаве, здзейсненую службовай асобай**, што займае адказнае становішча ці дзяржаўную пасаду, ці вайсковаслужбоўцаў любога ўзроўню.[30]

## «НАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ» ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

На пачатку 2023 г. адбыўся сістэмны перагляд асноўнага заканадаўства, якое тычыцца свабоды асацыяцыі, свабоды слова і функцыянавання грамадзянскай супольнасці ў цэлым. Яно было істотна абмежаванае. Цяпер дзяржава фармальна замацавала за сабой права «прызначаць» таго, хто будзе грамадзянскай супольнасцю.

[28] *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300268*

[29] *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300256&p1=1&p5=0*

[30] *Гл. пазіцыю беларускай праваабарончай супольнасці з нагоды пашырэння падставаў для прымянення смяротнага пакарання: https://belhelcom.org/ru/news/vyrazhaem-reshitelnyy-protest-protiv-ocherednogo-rasshireniya-sfery-primeneniya-smertnoy-1*

**Па-першае**, прыняты новы Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» — яркі прыклад **рэгуляцыі нерэгулюемага**.[31] Там утрымліваецца вызначэнне грамадзянскай супольнасці і суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, а таксама асноўныя задачы ўзаемадзеяння дзяржавы і суб'ектаў грамадзянскай супольнасці. Пры прадстаўленні закону ў Палаце прадстаўнікоў была наўпрост агучаная мэта яго распрацоўкі: кансалідацыя намаганняў асобы, грамадства і дзяржавы па рэалізацыі інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

**Па-другое**, ўнесеныя змены ў законы «Аб грамадскіх аб'яднаннях» і «Аб палітычных партыях».[33] Палажэнні абодвух законаў увялі яшчэ большыя абмежаванні для функцыянавання гэтых інстытуцый. Напрыклад, істотна павялічаны мінімальны парог колькасці членаў для стварэння палітычнай партыі (5000 замест 1000), устаноўленыя **агульныя мэты і задачы для ўсіх партый**, якія павінны быць замацаваныя ў статутах, напрыклад – забеспячэнне непахіснасці канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды.

**Па-трэцяе**, у траўні 2023 г. на грамадскае абмеркаванне вынесеная новая рэдакцыя закону «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях».[34] Апрача іншага, там прапануецца замацаваць «**асаблівую ролю Беларускай праваслаўнай царквы** ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і мастацкіх традыцый беларускага народу».

## УЗМАЦНЕННЕ МІЛІТАРЫЗАЦЫІ

За справаздачныя паўгода фіксуецца інтэнсіўны рух дзяржавы ў бок мілітарызацыі (у тым ліку ў кантэксце мабілізацыі).

Перш за ўсё гэта выражаецца ў **размеркаванні бюджэтных сродкаў** і ў працы з **чалавечым рэсурсам**. У кантэксце правоў чалавека апісаныя ніжэй змены пацягнуць сістэмныя парушэнні, як мінімум свабоды думкі і сумлення, права на жыццё і здароўе, права на адукацыю.

Так, напрыклад, у студзені стала заўважным істотнае **павелічэнне бюджэтаў** вобласцяў Беларусі і Мінска на мабілізацыю. У залежнасці ад вобласці выдаткі па графе «Нацыянальная абарона - забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі

---

31 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300250&p1=1&p5=0*
32 *http://www.house.gov.by/ru/news-ru/view/25-janvarja-goda-sostojalos-zasedanie-palaty-predstavitelej-na-kotorom-rassmotreno-desjat-64908-2023/*
33 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300251&p1=1*
34 *https://pravo.by/novosti/novosti-pravo-by/2023/june/74390/*

і мабілізацыі» павялічыліся ад 1,06 да 4,35 разоў (самы вялікі выдатак у Магілёўскай вобласці).[35] Па звестках Беларускага расследвальнага цэнтра ў чэрвені стала вядома, што Беларусь вылучыла з бюджэту 3,1 млн рублёў (больш за 1,1 млн еўра) на закуп расейскіх тактычных беспілотных авіяцыйных комплексаў. Гэта самая дарагая такая закупка міністэрства з пачатку вайны. Да гэтага ваеннае ведамства закупляла беспілотныя сістэмы толькі аднойчы - у 2021 годзе.[36]

Утраўні ў першым чытанні быў прыняты праект закона «Аб народным апалчэнні».[37] Каментуючы закон, міністр абароны адзначыў важнасць «магчымасці ўдзельнічаць у абароне краіны тым, хто не будзе ахоплены мабілізацыйнымі мерапрыемствамі».[38] Важна асабліва адзначыць, што ад удзелу ў народным апалчэнні нельга адмовіцца, а асобы, якія там знаходзяцца, надзяляюцца шэрагам правоў і паўнамоцтваў, уласцівых ваенным і супрацоўнікам сілавых структур (у тым ліку прымяняць і выкарыстоўваць зброю, затрымліваць людзей, абмяжоўваць рух транспартных сродкаў і іншае). Усё гэта можа ўяўляць **пагрозу для жыцця і здароўя людзей**, улічваючы палітычную ангажаванасць гэтага мерапрыемства, непадрыхтаванасць «апалчэнцаў», непразрыстасць і непадсправаздачнасць сістэмы.

Пры гэтым, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі А. Вольфавіч заявіў аб неабходнасці вярнуцца да савецкай практыкі, калі студэнтаў прызывалі ў войска падчас вучобы.[39] Нагадаем, такая практыка была ўведзена ў СССР падчас Афганскай вайны. Пры гэтым яшчэ ў пачатку года была перагледжана інструкцыя аб вызначэнні патрабаванняў да стану здароўя грамадзян, звязаных з воінскім абавязкам.[40] Патрабаванні сталі менш строгімі, гэта значыць, яны дазваляюць заклікаць на ваенную службу многіх з тых, хто раней быў нягодны па стане здароўя ў мірны час і/ці абмежавана прыдатны ў ваенны. Дзяржава тлумачыць гэта жаданнем саміх людзей, «якія не могуць рэалізаваць мару стаць ваеннымі»[41].

## «ПРАЦА» З БЕЛАРУСАМІ, ШТО З'ЕХАЛІ ПАСЛЯ 2020: МАНІПУЛЯЦЫЯ ВЯРТАННЕМ

Нягледзячы на тое, што ўлады адмаўляюць беспрэцэдэнтна вялікую плынь эміграцыі пасля падзеяў 2020 і грэбліва называюць тых, хто з'ехаў «збеглымі», у пачатку 2023 года яны асобна звярнуліся да гэтай тэмы. З'явіліся наратывы пра

35 *https://news.zerkalo.io/economics/31289.html?c*
36 *https://investigatebel.org/ru/news/zakupka-bespilotnikov-superkam*
37 *https://pravo.by/document/?guid=3941&p0=2023039001*
38 *https://news.zerkalo.io/life/32990.html?c*
39 *https://news.zerkalo.io/life/36600.html?c*
40 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22339478&p1=1&p5=0*
41 *https://www.youtube.com/watch?v=JCfWjFT4XgQ&t=151s*

тое, што «трэба прабачыць тым, хто раскаяўся і даць ім магчымасць вярнуцца дадому». Указам Лукашэнкі[42] у лютым 2023 г. была створаная гэтак званая «Камісія па вяртанні». Гэта сведчыць пра тое, што ўлады ўсё ж фіксуюць маштабы праблемы. Разам з тым фармулёўкі ўказа, наратывы гэтай тэмы, а таксама склад камісіі сведчаць аб спробе чарговы раз прынізіць годнасць людзей і парушыць іх правы.

**Па-першае**, кожны чалавек можа бесперашкодна вяртацца ў краіну свайго грамадзянства (гэта частка свабоды перамяшчэння).

**Па-другое**, у выпадку здзяйснення супрацьпраўнага ўчынку, кожны чалавек павінен мець гарантыі справядлівага суда. І ў гэтым кантэксце само стварэнне і надзяленне нейкага калегіяльнага несудовага органа паўнамоцтвамі вырашаць «каму даравацць, а каго мілаваць» - прававы нонсэнс.[43]

**Па-трэцяе**, сама назва ўказа - «Аб разглядзе зваротаў грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца за мяжой, па пытаннях учынення імі правапарушэнняў», сведчыць аб парушэнні прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці.

**Па-чацвёртае**, механізм і ўмовы звароту прадугледжваюць, што чалавек павінен абгаварыць сам сябе і «прызнацца» ў здзяйсненні «правапарушэнняў і злачынстваў пратэстнай накіраванасці» і па вяртанні публічна пакаяцца. Пры гэтым не выключана, што ў дачыненні да яго будуць зроблены нейкія працэсуальныя дзеянні, праўда, толькі са згоды Генеральнага пракурора. Таксама станоўчае рашэнне камісіі не дае імунітэту ў дачыненні да іншых «правапарушэнняў», якія не былі ўлічаныя камісіяй пры разглядзе заявы. Гэта дае магчымасць узбудзіць крымінальную справу па любых надуманых падставах у дачыненні да чалавека, які ўжо прайшоў праз працэдуру камісіі.

Такім чынам, гэта нават цяжка назваць «індульгенцыяй»: дзяржава ў любым выпадку захоўвае за сабой магчымасць далейшага адвольнага пераследу чалавека.

У склад камісіі, сярод іншых, увайшлі асноўныя прапагандысты, якія шырока выкарыстоўваюць радыкальныя формы мовы варожасці, што ўключаюць заклікі да фізічнага знішчэння апанентаў улады, а таксама прадстаўнікі сілавых структур. Па сваім складзе камісія з'яўляецца нечым сярэднім паміж таварыскім судом часоў позняга СССР і расстрэльнай «тройкай» сталінскага перыяду.

---

42 *https://president.gov.by/bucket/assets/uploads/documents/2023/25uk.pdf*

43 *Тут карысна ўспомніць і пра надзяленне Саўміна практычна судовай функцыяй у дачыненні да рашэнняў аб адабранні маёмасці па новым законе «Аб адабранні маёмасці» (пра што гаварылася вышэй). Усё гэта яшчэ адное сведчанне дэфолту сістэмы юстыцыі, аўтарытэту суда. Функцыі, якія павінен рэалізаваць выключна суд, аддаюцца выканаўчай уладзе.*

У пачатку 2023 г. таксама было апублікавана некалькі відэа сацыяльнай рэкламы, накіраваных на тых, хто з'ехаў, пад лозунгам «Вяртайся!». У адным з іх кадры пратэсту як «дрэннай» з'явы супрацьпастаўляюцца кадрам «мірнага жыцця» з афіцыйнай сімволікай як чагосьці «добрага».[44]

## УЖЫВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКІМІ ІНСТЫТУЦЫЯМІ СУПРАЦЬПРАЎНЫХ ПРАКТЫК СІЛАВЫХ СТРУКТУР І ІНШЫХ НЕЎЛАСЦІВЫХ ПРАКТЫК

Карт-бланш на гвалт, безадказна дадзены дзяржавай сілавым структурам у жніўні 2020 г., мае, акрамя іншага, яшчэ адзін небяспечны эфект - разбэшчванне грамадства ў сэнсе адсутнасці абмежавальнікаў. А менавіта беспакаранасці за гвалт, калі ён ужываецца дзеля «палітычна правільных», прадзяржаўных мэтаў. Паказальна, што сфера, у якой гэты эфект выявіўся ўпершыню, - сфера адукацыі.

У траўні 2023 г. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ужыў **супрацьпраўную практыку сілавых структур па здымцы і распаўсюджванні «пакаяных відэа»**. У афіцыйным акаўнце юрыдычнага факультэта ў Інстраграм былі апублікавана відэа, дзе студэнт факультэта «прызнаецца» ў распаўсюджванні «дыскрэдытуючых звестак у дачыненні да адміністрацыі юрыдычнага факультэта, а таксама звестак, якія ганьбяць БРСМ юрыдычнага факультэта». Пазней было апублікавана другое відэа, дзе студэнта, відаць па ўсім, прымусілі сказаць, што ў першым ён здымаўся добраахвотна. Гэты інцыдэнт быў асуджаны кааліцыяй беларускіх праваабарончых арганізацый.[45] У заяве падрабязна ўказаны разбор канкрэтных парушэнняў правоў чалавека ў гэтай сітуацыі.

У чэрвені стала вядома аб двух выпадках паказальных судоў проста ва ўніверсітэтах (да 2023 г. мелі месца паказальныя затрыманні ў навучальных установах). Па ініцыятыве Баранавіцкай міжраённай пракуратуры, у Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце адбылося паказальнае судовае паседжанне, на якім асудзілі студэнтку за абразлівы каментар у адрас Лукашэнкі, зроблены ёю ў інтэрнэце.[46] Таксама ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце судзілі двух студэнтаў па артыкуле аб прапагандзе або публічным прадстаўленні, вырабе, распаўсюджванні нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі.[47]

---

44 *https://www.youtube.com/watch?v=7V9Gqf0WV_Y*

45 *https://belhelcom.org/ru/news/sovmestnoe-zayavlenie-belarusskih-pravozashchitnyh-organizaciy-po-povodu-rasprostraneniya*

46 *https://nashaniva.com/ru/318578*

47 *https://nashaniva.com/ru/319132*

Разбэшчванне грамадства заключаецца таксама і ў тым, што пастулова радыкальную і зняважальную чалавечую годнасць рыторыку пачынаюць ужываць не толькі адыёзныя прапагандысты і прадстаўнікі сілавых структур, але і іншыя. Напрыклад, у чэрвені, абмяркоўваючы гістарычную памяць і сістэму адукацыі, адзін з прадстаўнікоў «моладзевага парламента» пры Нацыянальным сходзе сказаў, што ў выпадку скажэння фактаў і ўзняцця «вострых праблем» (заўв. - гісторыкамі, навукоўцамі, выкладчыкамі) можна даводзіць «аж да смяротнага пакарання».[48]

## ПАЛІТЫКА ПА ФАРМАЛІЗАЦЫІ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ ПА ПРЫКМЕТАХ СЭКСУАЛЬНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ, ГЕНДЭРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ І РЭПРАДУКТЫЎНАГА ВЫБАРУ

У справаздачным перыядзе адбылася якасная змена ў дзяржаўнай палітыцы ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці. Запазычаныя расійскія наратывы (як і ў выпадку з увядзеннем крымінальнай адказнасці за дыскрэдытацыю Узброеных Сіл) замацавання ў заканадаўстве фармальнай няроўнасці ў дачыненні да прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці і чайлдфры.

У красавіку Міністэрства інфармацыі прапанавала дапоўніць закон аб СМІ забаронай на прапаганду ЛГБТ.[49] А ў чэрвені Генпракуратура прапанавала пакет ініцыятываў «па абароне дзяцей ад сэксуальнага гвалту і эксплуатацыі», у тым ліку аб узмацненні адказнасці бацькоў і ўсталяванні адміністрацыйнай адказнасці за прапаганду нетрадыцыйных сэксуальных адносін, змены полу, педафіліі і чайлдфры; укаранення ў адукацыйны працэс абавязковага курса на тэму полавага выхавання.[50]

Важна назіраць, чым фактычна скончацца гэтыя ініцыятывы, аднак ужо цяпер можна прагназаваць павелічэнне ўразлівасці людзей ЛГБТК+, якія і без таго дыскрымінуюцца ў беларускім грамадстве. Апрача таго, у кантэксце згадвання спецыяльнага школьнага курса можна прагназаваць чарговы усплёск прапаганды ў школах, парушэнне права на адукацыю, свабоду меркаванняў, доступу да інфармацыі і ўмяшанне ў асабістае жыццё.

Варта адзначыць, што такая змена палітыкі і ўзмацненне ўвагі да ЛГБТК+ супольнасці таксама з'яўляецца часткай палітыкі па дыскрэдытацыі «заходніх» каштоўнасцяў, якія прыпісваюцца «супрацьлегламу лагеру» (як і кампанія па рэфрэймінгу генацыду).

---

48 *https://www.youtube.com/watch?v=qRSU9h_TFQg*
49 *https://t.me/housegovby/10225*
50 *https://t.me/prokuraturabelarus/4397*

Пры гэтым паказальна, што ў адным пакеце з апісанымі ініцыятывамі ідзе таксама і прапанова дзяржавы аб унясенні змяненняў у КК у частцы пакарання за педафілію - прапануецца хімічная кастрацыя. **Па-першае**, гэта таксама відавочная маніпуляцыя для ўзмацнення стыгматызацыі ЛГБТК+ супольнасці, прадстаўнікоў і прадстаўніц якой гамафобная рыторыка часта асацыюе ў тым ліку і з педафіламі. **Па-другое**, гэта яшчэ адно парушэнне Беларуссю сваіх міжнародных абавязальніцтваў у сферы правоў чалавека, у адпаведнасці з якімі незалежна ад цяжару злачынстваў пакаранне не павінна парушаць абсалютную забарону на прымяненне катаванняў і іншых бесчалавечных відаў пакаранняў, да якіх адносіцца, у тым ліку, хімічная кастрацыя.[51]

## НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ЎСТУПНАЙ КАМПАНІІ: ПАТРАБАВАННІ ДА АБІТУРЫЕНТАЎ, ЯКІЯ СТВАРАЮЦЬ ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

У пачатку студзеня 2023 г. указам Лукашэнкі была зацверджана новая рэдакцыя Правілаў прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя адукацыйныя ўстановы.[52] Адно з новаўвядзенняў - абавязковая характарыстыка з месца вучобы, якую павінны будуць падаваць абітурыенты ў прыёмныя камісіі. Гэтае правіла распаўсюджваецца на тых, хто паступае як на дзённае, так і на завочнае аддзяленне. Што цікава, гэтае правіла не распаўсюджваецца на замежных грамадзян. Міністэрства адукацыі распрацавала форму характарыстыкі.[53] Яна ўключае 7 разгорнутых пунктаў, дзе запытваецца інфармацыя, для якой няма ніякіх законных падставаў і сэнсу, таму што яна датычыцца асабістага жыцця, перакананняў чалавека. Напрыклад, у пункце «маральныя якасці» трэба ўказаць «стаўленне да дзяржаўных і грамадскіх інстытуцый, канстытуцыйнага ладу». Таксама асобным пунктам трэба ўказваць інфармацыю аб удзеле ў грамадскіх мерапрыемствах, маладзёжных грамадскіх арганізацыях. Апрача гэтага, асобны пункт прысвечаны звесткам аб дысцыплінарных спагнаннях на працягу апошняга года да выдачы характарыстыкі, аб індывідуальнай прафілактычнай рабоце з абітурыенткай ці абітурыентам.

Каментуючы гэта новаўвядзенне, прадстаўнік Міністэрства адукацыі адзначыў, што такая характарыстыка «не будзе ўплываць на конкурсную сітуацыю, але вельмі важная для таго, каб адразу ж уключыць студэнта ў грамадскае жыццё навучальнай установы».[54]

---

51 *Гл. заяву беларускіх праваабарончых арганізацый адносна ініцыятываў Генпракуратуры: https://belhelcom.org/be/news/patrabuem-prytrymlivacca-mizhnarodnyh-abavyazkau-belarusi-u-sfery-seksualnyh-i-repradukcyynyh*

52 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32300002&p1=1*

53 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22339639&p1=1&p5=0*

54 *https://www.bpc.by/ru/press-meropriyatiya/item/817-press-konferentsiya-o-realizatsii-ukaza-prezidenta-respubliki-belarus-ot-3-yanvarya-2023-goda-2-novaya-redaktsiya-pravil-priema-lits-dlya-polucheniya-obshchego-vysshego-i-spetsialnogo-vysshego-obrazovaniya.html*

Разам з тым, зыходзячы з формы характарыстыкі, відавочна, што запытаныя звесткі накіраваныя на выяўленне людзей з «правільнымі» і «няправільнымі» палітычнымі поглядамі. Такая інфармацыя ў сённяшніх умовах адразу задае пэўны вектар працы з чалавекам і адносіны да яе/яго і, нават калі не паўплывае на шанцы пры паступленні, відавочна, будзе ўплываць на «жыццё» у працэсе навучання.

Таксама відавочна, што такія патрабаванні ствараюць дадатковы ціск на абітурыента(ў)к, многія з якіх, каб пазбегнуць чаканых непрыемнасцяў, будуць вымушаныя альбо ўступаць у БРСМ[55], альбо ўдзельнічаць у праўладных мерапрыемствах і г.д, каб гэта было адлюстравана ў характарыстыцы.

## АГУЛЬНЫ АДЫХОД АД ФАРМАЛЬНАЙ РОЎНАСЦІ

У асобны трэнд важна вылучыць агульны рух дзяржавы да фармалізацыі дыскрымінацыі і адыход ад фармальнага прынцыпу роўнасці. Да гэтага часу асноўнай праблемай была фактычная дыскрымінацыя: гэта значыць пры фармальна замацаванай у законе роўнасці ў шэрагу сфер ажыццяўлялася дыскрымінацыйная палітыка і практыка. Фактычная дыскрымінацыя нікуды не знікла, але пасля 2020 г. пачаўся рух да легалізацыі няроўнасці.

Менавіта за першае паўгоддзе 2023 года набралася крытычная маса па розных кірунках. Суб'ектны падыход у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, навацыі Закона аб грамадзянстве (у тым ліку асаблівыя патрабаванні да людзей з замежнымі відамі на жыхарства), абмежаванне выезду з краіны для пэўных груп беларусаў, пашырэнне магчымасці прымянення пакарання смерцю за здраду дзяржаве для службовых асоб і вайскоўцаў, заканадаўчае замацаванне «правільнай» грамадзянскай супольнасці, ініцыятыва па фармалізацыі дыскрымінацыі па прыкмеце сэксуальнай арыентацыі, гендэрнай ідэнтычнасці і рэпрадуктыўнага выбару, увядзенне новых патрабаванняў для абітурыентаў - усё гэта відавочна сведчыць пра тое, што дзяржава заканадаўча ў розных сферах **пачала дзяліць людзей на «розныя гатункі» па прыкмеце ляяльнасці дзяржаве ці паводле сістэме каштоўнасцяў.**

Пры гэтым, вырасла інтэнсіўнасць фармалізацыі няроўнасці не толькі ў кантэксце падзелу людзей па каштоўнасцях, але і ў кантэксце **спажывецкага стаўлення да чалавека і ягонай «карыснасці» для дзяржавы**.

Так, з 2023 г. у Беларусі ўсё ж уводзіцца патрабаванне асаблівых выплат з боку «незанятых у эканоміцы» (так званы падатак для «дармаедаў»). Гэты падатак спрабавалі ўвесці яшчэ ў 2015 г., але адмянілі пасля пратэстаў

55 *Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі – праўладнае моладзевае аб'яднанне, https://brsm.by/*

2017 г. і замянілі на абавязак плаціць поўны кошт камунальных паслуг.[56] З 2023 г. у дачыненні да людзей, якія больш за пяць гадоў бесперапынна лічыліся ў базе «дармаедаў», будуць ажыццяўляцца адмысловыя праверкі на адпаведнасць выдаткаў прыбыткам. Для такіх людзей уведзены абмежаванні на грашовыя паступленні ад сваякоў, якія не абкладаюцца падаткам (не больш за 100 базавых велічынь на год; прыкладна 1170 еўра). За большыя сумы трэба будзе плаціць. Апрача таго, што гэта з'яўляецца парушэннем права на працу, гэта таксама з'яўляецца фармальна замацаваным няроўным абыходжанні па прыкмеце працаўладкавання.

Таксама, у чэрвені 2023 г. Міністэрства аховы здароўя выдала загад, паводле якога колькасць месцаў для размеркавання ў субардынатуру[57] хірургічнага профілю «вызначаецца асобна для студэнтаў мужчынскага і жаночага полу».[58] У самім загадзе ўказваецца, што ён выдадзены для больш эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў вышэйшай медыцынскай адукацыі для задавальнення патрэбаў ва ўрачах-спецыялістах. Пры гэтым, такое размеркаванне наўпрост дыскрымінуе менавіта жанчын, бо колькасць месцаў для іх у адрозненне ад студэнтаў-мужчын несувымерна меншая. Такім чынам атрымліваецца, што мужчын бяруць нягледзячы на нізкія балы.

Апрача супрацьпраўнасці самога факту няроўнага абыходжання, гэта парушае права на адукацыю (як студэнтак, якія нягледзячы на высокі бал і асабістыя здольнасці, не могуць абраць спецыялізацыю па жаданні, так і студэнтаў, якім у шэрагу выпадкаў навязваецца нежаданая спецыялізацыя толькі таму, што яна лічыцца «мужчынскай»).

---

56 *https://news.zerkalo.io/economics/29702.html?c*

57 *Першасная спецыялізацыя студэнтаў старэйшых курсаў медыцынскіх ВНУ.*

58 *https://nashaniva.com/320585*

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРЫКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ

ГАЛОЎНАЕ:

- пашыраюцца формы адвольнага ўмяшання ў асабістае жыццё чалавека;
- *incommunicado* ў дачыненні да палітычных апанентаў, якія знаходзяцца ў турме;
- першы прысуд за «беларускі нацыяналізм».

## УЗМАЦНЕННЕ ПРАВЕРАК НА МЕЖАХ

Асаблівую ўвагу да людзей, якія актыўна ўдзельнічалі ў пратэстах, на мяжы праяўлялі даўно. Па стане на пачатак 2023 г. па дадзеных ПЦ «Вясна» затрыманыя 58 чалавек, якія часова вярнуліся ў Беларусь з-за мяжы па тых ці іншых прычынах.[59] Але пасля дыверсіі ў дачыненні да расійскіх самалётаў, размешчаных на аэрадроме ў Мачулішчах, 26 лютага 2023 г. праверкі на мяжы ўзмацніліся і якасна змяніліся.

**Па-першае**, людзей сталі дапытваць супрацоўнікі спэцслужбаў у цывільным, якія адмаўляюцца прадставіцца. **Па-другое**, цяпер памежнікі патрабуюць прад'явіць від на жыхарства іншых краін (пры наяўнасці), пасля чаго дакументы фатаграфуюць і скануюць. Наяўнасць такога дакумента часта становіцца падставай для далейшага ўзмоцненага агляду і допыту.[60]

Можна вылучыць тры асноўныя групы, да якіх узнікае асаблівая цікавасць на мяжы: людзі, якія прыцягваліся па «палітычных» артыкулах і знаходзяцца ў базе «Беспарадкі»[61], людзі, у якіх ёсць ВНЖ ці нацыянальныя візы краін ЕС, украінцы, якія жывуць у Беларусі, а таксама іх сваякі.[62] Таксама ёсць звесткі, што асаблівую ўвагу выклікаў факт бясплатнай выдачы візы (гэта пазначана ў самой візе).

59 *https://spring96.org/ru/news/110613*
60 *https://spring96.org/ru/news/111864*
61 *Па наяўных звестках, у гэтую базу адвольна ўключаюцца ўсе, хто быў затрыманы з нагоды ўдзелу ў пратэстах, нават калі справа была спыненая (такіх выпадкаў адзінкі).*
62 *https://news.zerkalo.io/life/40238.html?c*

## УЗМАЦНЕННЕ КАНТРОЛЮ ЗА ВАЙСКОВААБАВЯЗАНЫМІ

Пры пастаноўцы падлеткаў на воінскі ўлік задаюць пытанні аб стаўленні да ваенных дзеянняў на тэрыторыі Украіны.[63] Адбыўся тэрміновы прызыў на «зборы» ў рамках праверкі баявой гатоўнасці арміі (у некаторых выпадках людзей забіралі проста з працы і везлі ў вайсковыя часткі).[64] Адбыўся датэрміновы выклік на пераагляд мужчын са статусам «непрыгодны ў мірны час» у сувязі з пераглядам крытэрыяў (гл. I раздзел гэтага Агляду).[65] У красавіку 2023 г. у лячэбныя ўстановы Брэсцкай вобласці ад галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя паступіла распараджэнне ўзмацніць кантроль за выдачай ліісткоў непрацаздольнасці («бальнічных») і абгрунтаванасці шпіталізацый у дачыненні да ваеннаабавязаных.[66]

## ПЕРАСЛЕД ЗА ФІНАНСАВЫЯ АХВЯРАВАННІ Ў ФОНДЫ, ЯКІЯ ДАПАМАГАЮЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫМ АД РЭПРЭСІЙ

У пачатку года з адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій[67] у IT кампаніі-рэзідэнты Парку сталі прыходзіць лісты са спісамі супрацоўнікаў, якія пералічвалі грошы ў фонды «Фонд салідарнасці BYSOL» і «BY_help», якія дзяржава прызнала экстрэмісцкімі фармаваннямі. Кіраўніцтва кампаній размаўляла з працаўнікамі і прапаноўвала пайсці на гутарку з супрацоўнікамі КДБ.[68] Апрача іншага, гэта яскравы прыклад таго, як дзяржава прыцягвае бізнэс да парушэння правоў чалавека (у гэтым выпадку правоў уласных супрацоўнікаў).[69]

Людзі, якія пабылі на гэтых гутарках, казалі, што трэба было напісаць «пакаяльную» тлумачальную наконт данатаў у фонды і ахвяраваць шматкроць большую суму нібыта на дабрачыннасць адрасатам, якіх назавуць супрацоўнікі КДБ.Людзі таксама адзначалі, што ў адказ на гэта ім выдавалі альбо абяцалі выдаць пастанову аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы.[70]

Пры гэтым, у сакавіку стала вядома як мінімум аб чатырох арыштах супрацоўнікаў IT-кампаній, супраць якіх распачалі крымінальныя справы за ахвяраванні. Няясна, ці зьвязана гэта зь іх адмовай плаціць унёскі, якія патрабавала КДБ.[71]

63 *https://news.zerkalo.io/life/33508.html?c*
64 *https://news.zerkalo.io/life/36189.html?c*
65 *https://news.zerkalo.io/life/39423.html?c*
66 *https://t.me/belhalat_by/8308*
67 *https://www.park.by/*
68 *https://devby.io/news/donaty-spiski*
69 *Глядзіце падрабязней пра гэты аспект: https://devby.io/news/anklav-svobody*
70 *https://news.zerkalo.io/life/30049.html?utm_source=editorial_block&utm_campaign=recirculation_tut&utm_medium=read_more*
71 *https://devby.io/news/arestovali-za-donaty*

Пазней за ахвяраванні ў фонды салідарнасці сталі пераследваць не толькі супрацоўнікаў ІТ-кампаній. У раённыя аддзелы КДБ Мінска сталі выклікаць людзей розных прафесій наконт данатаў, зробленых праз Фэйсбук у 2020 г. Супрацоўнікі КДБ паказвалі скрыншоты пералічэння грошай і ставілі ультыматум: яўка з пакаяннем ці турма.[72]

У траўні практыка яшчэ больш пашырылася: да КДБ далучыўся ДФР, некаторых работнікаў бюджэтных арганізацый, якія заданацілі, сталі звальняць, некаторых людзей затрымлівалі за гэта проста на мяжы (гэта значыць на мяжы таксама ёсць гэтыя спісы).[73]

Адзначым, што ціснуць і на людзей, якія зрабілі ахвяраванні ў т.зв. «экстрэмісцкія» фонды яшчэ да прызнання тых экстрэмісцкімі фармаваннямі.

Пры гэтым да ІТ-сектара ўсё ж асаблівае стаўленне. Улады не хочуць губляць вялікую крыніцу прыбытку і разумеюць, што масавы ад'езд ІТ-сектара пасля 2020 г. наносіць сур'ёзную шкоду эканоміцы. У сувязі з гэтым вельмі паказальны той факт, што ў КДБ з'явіўся спецыяльны аддзел для працы з супрацоўнікамі ІТ-кампаній.[74]

## МАСАВАЕ ПАРУШЭННЕ ПРАВОЎ ДЗЯЦЕЙ СІЛАВЫМІ ОРГАНАМІ

Парушэнне правоў непаўналетніх з боку беларускіх сілавых органаў - не новая тэндэнцыя.[75] Аднак у 2023 г. упершыню зафіксаваны эпізод масавага парушэння: у лютым у розных гарадах Беларусі затрымалі 183 непаўналетніх - прыхільнікаў маладзёжнай субкультуры «Рэдан» і ўдзельнікаў запланаванай сустрэчы так званага «ПВК Рэдан».

МУС патлумачыла гэта «магчымай масавай бойкай». МУС таксама заявіла, што падлеткі да 16-ці гадоў атрымаюць папярэджанні з пастаноўкай на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх. Тым, хто старэйшы за 16 гадоў, дадаткова пагражае адміністрацыйная адказнасць.[76] Пры гэтым у некаторых РАУС затрыманых дзяцей доўга трымалі на холадзе з паднятымі рукамі.

71 *https://devby.io/news/arestovali-za-donaty*
72 *https://t.me/viasna96/17231*
73 *https://news.zerkalo.io/life/40404.html?c*
74 *https://news.zerkalo.io/life/40711.html?c*
75 *Глядзіце Аналітычны даклад БХК аб парушэннях асобных правоў дзіцяці (школа, сілавыя органы, медыцына), 2021-2022: https://belhelcom.org/ru/document/analiticheskiy-doklad-o-narusheniyah-otdelnyh-prav-rebenka-shkola-pravoohranitelnye-organy*
76 *https://t.me/pressmvd/7033*

Гэты інцыдэнт таксама прывёў да ціску на бацькоў і дзяцей праз школу. У шэрагу школ бацькі пачалі атрымліваць ад адміністрацыі патрабаванні трымаць дзяцей пасля ўрокаў пад сваім кантролем.[77] БХК рабіў падрабязны разбор гэтага інцыдэнту з пункту гледжання балансу паміж грамадскай бяспекай і правам дзяцей на свабоднае выказванне меркавання і свабоду сходаў.[78]

## *INCOMMUNICADO* У ДАЧЫНЕННІ ПАЛІТВЯЗНЯЎ

Улады ўвесь час парушаюць умовы ўтрымання палітычных вязняў. Але ў пачатку 2023 г. асабліва яскрава выявілася практыка адразання ад знешняга свету шэрагу асабліва медыйных і вядомых палітвязняў, палітвязняў-палітычных лідэраў.

Так, у канцы красавіка стала вядома, што прэтэндэнт у кандыдаты на пасаду прэзідэнта В. Бабарыка патрапіў у шпіталь са слядамі збіцця. Гэтыя звесткі пацвердзілі ў самім шпіталі, а ў пачатку чэрвеня стала вядома аб затрыманні, арыштах і штрафе і аб наступным звальненні з гэтай бальніцы пяцёх урачоў.[79]

Перад гэтым каля двух месяцаў ад В.Бабарыкі не паступала пісьмовая карэспандэнцыя.[80] Пры гэтым, у канцы сакавіка затрымалі апошняга адваката, які працаваў па справе В. Бабарыкі, а таксама адвакатаў іншых вядомых палітвязняў. У пачатку траўня сваякам В. Бабарыкі адмовілі ў прыёме ў ДВП.[81]

Па стане на канец чэрвеня няма ніякіх звестак аб месцы знаходжання і стане В. Бабарыкі. Таксама з пачатку лютага няма ніякіх звестак пра М.Статкевіча. З сакавіка няма ніякіх звестак пра С. Ціханоўскага. У поўнай ізаляцыі таксама знаходзяцца М.Знак, М.Калеснікава, І. Лосік.

## ПЕРШЫ (ПУБЛІЧНА ВЯДОМЫ) ПРАМЫ КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД АДВАКАТА ЗА АКАЗАННЕ ПРАВАВОЙ ДАПАМОГІ СВАІМ КЛІЕНТАМ

Улада масава і сістэмна пераследуе адвакацкую супольнасць вось ужо 3 гады.[82] Па стане на канец чэрвеня 2023 г. 10 адвакатаў з'яўляюцца абвінавачанымі або атрымалі прысуды па сфабрыкаваных крымінальных справах, з іх 7 знаходзяцца ў зняволенні.[83]

77 *https://news.zerkalo.io/life/33675.html?c*
78 *https://belhelcom.org/ru/news/chvk-redan-gosudarstvo-kultura-nasiliya-prava-cheloveka*
79 *https://euroradio.fm/ru/vsekh-medikov-zaderzhannykh-v-novopolocke-uvolili-za-proguly*
80 *https://www.dw.com/ru/sopernik-lukasenko-babariko-gospitalizirovan/a-65449555*
81 *https://d367rzjs5oyeba.cloudfront.net/315771?lang=ru*
82 *https://www.defenders.by/lawyers-persecution-2020*
83 *https://www.defenders.by/criminal_prosecution_2020*

У пачатку 2023 г. прад'явілі абвінавачанне адвакату А. Данілевічу. Зыходзячы з абвінавачання яму наўпрост ставілася ў віну выкананне сваіх прафесійных абавязкаў – аказанне прававой дапамогі. У абвінавачанні прыкладамі злачыннай дзейнасці А.Данілевіча называецца «падрыхтоўка лістоў і дакументаў у адрас нарвежскай кампаніі «Yara», якая з'яўляецца надзейным буйным пакупніком прадукцыі ААТ «Беларуськалій» - калійных угнаенняў».[84]

Разам з тым, гэтыя лісты адрасаваліся кампаніі з мэтай нагадаць ёй пра міжнародныя рамкі адказных паводзінаў бізнэсу і аб правілах уласнай унутранай палітыкі, у адпаведнасці з якімі кампанія абавязаная рэагаваць на парушэнні правоў чалавека ў сваім ланцужку паставак (у гэтым выпадку на шматлікія парушэнні правоў прафсаюзаў і іншых правоў работнікаў з боку ААТ «Беларуськалій»).

Пры гэтым важна адзначыць, што на гэты момант мы не ведаем сутнасці і дэталяў абвінавачанняў у астатніх 9 адвакатаў.

## ПЕРШЫЯ ПРЫСУДЫ *IN ABSENTIA* (ЗАВОЧНЫЯ СУДЫ)

У 2022 г. былі ўнесены змены ў КК, у адпаведнасці з якімі стала магчымым завочнае судаводства. Улады выкарыстоўваюць гэта як «меру ў адказ» у дачыненні да сваіх асноўных апанентаў, якіх яны не могуць «дастаць», бо тыя знаходзяцца па-за краінай.

У 2023 г. былі вынесеныя першыя прысуды: у студзені па 12 гадоў атрымалі пяцёра абвінавачаных па справе «Чорнай кнігі Беларусі»,[85] у лютым да 15 гадоў была асуджаная С. Ціханоўская, да 18 – П. Латушка, па 12 гадоў атрымалі М. Мароз, В. Кавалькова і С. Дылеўскі.[86]

Апрача парушэння права на справядлівы суд канкрэтных людзей практыка завочных судоў з'яўляецца **яшчэ адной прыступкай уцягвання судовай сістэмы і суддзяў у вынясенне неправасудных рашэнняў і рэпрэсіі**.

## ПЕРШЫ ПРЫСУД ЗА «БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛІЗМ»

У траўні быў абвешчаны прысуд вядомаму грамадскаму дзеячу П.Белавусу, дырэктару крамы Symbal.by, актыўнаму папулярызатару беларускай культуры. Упершыню ў абвінаваўчым заключэнні прагучала прамое абвінавачанне ў беларускім нацыяналізме: «пад выглядам культурна-гістарычнага развіцця ў

84 *https://belhelcom.org/ru/news/zayavlenie-v-svyazi-s-ugolovnym-presledovaniem-advokata-aleksandra-danilevicha*
85 *https://reform.by/po-delu-chkb-vynesli-zaochnye-prigovory-po-12-let*
86 *https://reform.by/dylevskij-kovalkova-i-moroz-poluchili-po-12-let*

розных агульнадаступных сацыяльных сетках і на сайтах распаўсюджваў ідэі беларускага нацыяналізму, мэтай якіх з'яўлялася змена дзяржаўнай улады ў Беларусі».[87]

У сукупнасці з іншымі фактамі (напрыклад, забарона выкарыстоўваць беларускую лацінку ў найменні геаграфічных назваў і аб'ектаў у 2022 г.,[88] дзяржаўная кампанія па рэфрэймінгу генацыду і інш.) гэта відавочна сведчыць аб **наўмыснай дыскрэдытацыі беларускай нацыянальнай культуры і гісторыі як часткі рэпрэсіўнай палітыкі** і прасоўванні на дзяржаўным узроўні **наратываў каланіяльнай палітыкі Расіі**. Што, у тым ліку, з'яўляецца сістэмным парушэннем культурных правоў беларусаў.

## УЗМАЦНЕННЕ ПРАПАГАНДЫ ВАЙНЫ І ІНДАКТРЫНАЦЫІ РАСІЙСКІМІ НАРАТЫВАМІ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

У цэлым усе асноўныя тэндэнцыі ідэалагізацыі адукацыі[89] захоўваюцца. Пры гэтым ёсць некаторыя значныя змены ў ідэалагічнай апрацоўцы школьнікаў і студэнтаў ваенных і сілавых ВНУ у частцы прапаганды вайны і расійскіх наратываў.

**Па-першае**, калі ў 2022 г., адразу пасля пачатку вайны, у шэрагу школ настаўнікі ці адміністрацыя падчас «інфармацыйнай працы» проста апраўдвалі такія дзеянні, у 2023 г. яны пачалі па сутнасці **прапагандаваць канкрэтныя ваенныя злачынствы** (у прыватнасці, несудовыя кары смерцю). Так, у сакавіку 2023 г., гімназія Рэчыцы прыняла ў падарунак для школьнага музея молат ад чалавека, як мяркуецца, уваходзіць у ПВК «Вагнер» і датычны да пазасудовых караў смерцю, у тым ліку з дапамогай молату, у Сірыі ў 2017 г.[90]

**Па-другое**, дзяцей **прымушаюць «ушаноўваць памяць» расійскіх прапагандыстаў**, прадстаўляючы іх героямі. Так, напрыклад, у красавіку 2023 г., у Гомелі школьнікаў прывялі ў «Рускі дом» на мерапрыемства, прымеркаванае да дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Дзецям паказалі фільм «Артэк. Вялікае падарожжа». А перад сеансам «ушанавалі памяць расійскага ваенкара Уладлена Татарскага, які трагічна загінуў ад тэракту ў пецярбургскім кафэ» — вучні пры гэтым трымалі партрэт загінулага прапагандыста з надпісам «Вечная памяць герою, вораг будзе разбіты, перамога будзе за намі».[91]

87 *https://citydog.io/post/zaden-syd-nachalo/*
88 *https://news.zerkalo.io/life/29916.html?c*
89 *Гл. Аналітычны даклад БХК аб парушэннях асобных правоў дзіцяці (школа, праваахоўныя органы, медыцына), 2021-2022: https://belhelcom.org/ru/document/analiticheskiy-doklad-o-narusheniyah-otdelnyh-prav-rebenka-shkola-pravoohranitelnye-organy*
90 *https://malanka.media/news/24259*
91 *https://news.zerkalo.io/life/36064.html?c*

**Па-трэцяе, фіксуецца непасрэдны расейскі ўдзел у прапагандзе, накіраванай на студэнтаў ваенных і сілавых ВНУ**: напрыклад, у канцы лютага Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь разам з Міжнародным фондам сацыяльнай і эканамічнай падтрымкі дзеячаў культуры і мастацтваў Народнага артыста Беларусі Уладзіміра Гасцюхіна арганізавала ў Мінску прагляд мастацкага фільма «Дзе праходзіць мяжа?».[92] Паказ быў арганізаваны для курсантаў Інстытута памежнай службы, беларускіх акадэмій МУС і МНС, вайсковага факультэта БДУ. Гэты фільм апраўдвае агрэсію Расіі ў адносінах да Украіны і зняты пры падтрымцы расійскага Прэзідэнцкага фонду культурных ініцыятываў. Дарадца-пасланнік пасольства РФ В.Ванькe сказаў, што гэта не разавая акцыя.

**Па-чацвертае,** з пачатку года адукацыйныя ўстановы **пачалі актыўна шукаць людзей на пасаду кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні**. Паводле інфармацыі Беларускага расследвальнага цэнтра, за тры месяцы з пачатку 2023 г. служба занятасці размясціла 182 такія вакансіі. У шматлікіх вакансіях адным з абавязковых патрабаванняў паказаны досвед службы ва ўзброеных сілах. У адной з мінскіх школ на такую пасаду былі гатовыя ўзяць «байца ПВК Вагнер, які ваяваў ва Украіне, з расійскім грамадзянствам».[93]

92 *https://sputnik.by/20230228/nuzhna-li-svo-v-minske-pokazali-film-ob-etom-1072751018.html*
93 *https://investigatebel.org/ru/news/minskaya-shkola-gotova-nanyat-byvshego-naemnika-chvk-vagnera*

# III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ У РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ШТО ДАТЫЧАЦЬ СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА У БЕЛАРУСІ

ГАЛОЎНАЕ:

- Савет па правах чалавека ААН прызнаў здзяйсненне ўладамі Беларусі злачынстваў супраць чалавечнасці;
- Парламенцкая асамблея Савета Еўропы прызнала значнасць праблемы палітычнай эміграцыі беларусаў пасля 2020 г.;
- МАП прыняла канкрэтныя рэкамендацыі па абмежавальных мерах у дачыненні да Беларусі ў рамках арт. 33 Статута МАП.

## ПРЫЗНАННЕ ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЎЛАДАМІ БЕЛАРУСІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ НАПЯРЭДАДНІ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ 2020 І ПАСЛЯ ІХ

У лютым 2023 г. у Дакладзе Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, зробленага ў рамках мандата па разглядзе пытання аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, і на падставе высноваў спецыяльна прызначаных экспертаў **упершыню было агучана**, што некаторыя са злачынстваў, учыненыя напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 г. і пасля іх «могуць таксама **прыраўноўвацца да злачынстваў супраць чалавечнасці** ў тым выглядзе, як іх вызначае міжнароднае права, калі такія дзеянні здзяйсняюцца ў рамках шырокамаштабнага ці сістэматычнага нападу на любых грамадзянскіх асобаў, і калі такі напад здзяйсняецца свядома».[94]

[94] *https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/G23/009/01/PDF/G2300901.pdf?OpenElement*

# ПАЎТОРНЫ ЗАПУСК МАСКОЎСКАГА МЕХАНІЗМУ АБСЕ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА СІТУАЦЫІ З БЕЛАРУССЮ

У кантэксце сітуацыі з выбарамі ў Беларусі 2020 г. упершыню Маскоўскі механізм АБСЕ быў запушчаны ў 2020 г. па ініцыятыве 17 дзяржаў-членаў АБСЕ.[95] У сакавіку 2023 г. па ініцыятыве ўжо 38 краін-членаў АБСЕ Маскоўскі механізм быў запушчаны другі раз.[96]

Разам з тым, важна адзначыць, што па выніках другога дакладу, у адрозненне ад першага (зробленага прафесарам Вольфгангам Бенедэкам), не было зроблена нейкіх істотных і прынцыпова новых рэкамендацый.

Нагадаем, што ў першым дакладзе было рэкамендавана заснаваць незалежны міжнародны орган з мэтай уважлівага расследавання з удзелам экспертаў-крыміналістаў парушэнняў правоў чалавека ў кантэксце прэзідэнцкіх выбараў. У такім выглядзе рэкамендацыя не была ўлічана, аднак шмат у чым грунтуючыся на гэтай рэкамендацыі, у сакавіку 2021 г. пад эгідай Вярхоўнага камісара па правах чалавека ААН быў заснаваны мандат па разглядзе пытання аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі[97] і ў траўні 2021 г. прызначаны 3 эксперты для ажыццяўлення гэтага мандата.[98]

# ПРЫЗНАННЕ СІТУАЦЫІ З ПАЛІТЫЧНАЙ ЭМІГРАЦЫЯЙ БЕЛАРУСАЎ ПАСЛЯ ПАДЗЕЯЎ 2020 ЯЎНАЙ, БАЧНАЙ ПРАБЛЕМАЙ НА РЭГІЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ, ЯКАЯ ПАТРАБУЕ СКАНСАЛІДАВАНЫХ ДЗЕЯННЯЎ ЕЎРАПЕЙСКІХ ДЗЯРЖАВАЎ

У самым пачатку года ў Камітэце ПАСЕ па міграцыі, бежанцах і перамешчаных асобах быў прызначаны спецыяльны дакладчык для падрыхтоўкі дакладу, які тычыцца сітуацыі з беларусамі ў выгнанні.[99] На пачатку чэрвеня ён прадставіў даклад «Звяртаючыся да асаблівых выклікаў, з якімі сутыкаюцца беларусы ў выгнанні».[100] Даклад закранае шырокае кола пытанняў, пачынаючы ад легалізацыі і заканчваючы доступам да адукацыі, магчымасцю працягваць займацца сваёй

---

95 *https://www.osce.org/odihr/469539*
96 *https://www.osce.org/files/f/documents/b/8/543246.pdf*
97 *https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/G21/073/49/PDF/G2107349.pdf?OpenElement*
98 *https://www.ohchr.org/en/press-releases/2021/05/bachelet-appoints-experts-ohchr-examination-belarus?LangID=E&NewsID=27105*
99 *https://pace.coe.int/en/news/8955/belarusians-in-exile-an-overlooked-issue-addressed-by-the-parliamentary-assembly*
100 *https://pace.coe.int/en/files/31822/html*

прафесіяй, а таксама закранае пытанне «падвойнага» выгнання тых беларусаў, якія пасля пачатку вайны былі вымушаныя пакінуць Украіну. На аснове дакладу прынята рэзалюцыя ПАСЕ, цалкам прысвечаная гэтаму пытанню.[101]

## ПРЫНЯЦЦЁ МАП КАНКРЭТНЫХ РЭКАМЕНДАЦЫЙ ПА МЕРАХ У ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ У РАМКАХ ПРЫМЯНЕННЯ АРТ. 33 СТАТУТА МАП

У 2023 г. завяршыўся разгляд сітуацыі па Беларусі ў МАП, распачаты ў лістападзе 2020 г. у сувязі з падзеямі, якія адбыліся пасля прэзідэнцкіх выбараў. Беларусь стала другой краінай[102] за больш за 100-гадовую гісторыю МАП, у дачыненні да якой прынятае рашэнне аб прымяненні санкцый на падставе арт. 33 Статута МАП.

Такое рашэнне прынятае ў сувязі з парушэннямі свабоды асацыяцый і правоў прафсаюзаў. МАП абмяркоўвала праблемы ў палітыцы ўладаў у дачыненні да прафсаюзаў яшчэ з 2004 г., аднак пасля 2020 г. парушэнні выйшлі на якасна новы ўзровень па масавасці і жорсткасці.[103]

Рашэнне аб прымяненні ў дачыненні да Беларусі арт. 33 Статута дазволіць адвакатаваць сітуацыю на іншым узроўні.

**Па-першае**, сама па сабе ўнікальнасць сітуацыі (другі выпадак у гісторыі МАП) сведчыць аб экстрэмальным парушэнні правоў прафсаюзаў і дазваляе лепш аргументаваць патрабаванні ў прыняцці больш жорсткіх і канкрэтных мер.

**Па-другое**, у адрозненне ад рэзалюцый іншых міжнародных інстытуцый, апрача звароту да ўрадаў у рэзалюцыі змяшчаецца зварот яшчэ да двух актараў: працадаўцаў (бізнэсу) і работнікаў (прафсаюзаў). Гэта абумоўлена спецыфікай трохбаковага сяброўства ў МАП. Такім чынам, з'яўляецца падстава для больш інстытуцыйнай і сістэмнай працы з гэтымі дзвюма групамі стэйкхолдэраў.

**Па-трэцяе**, у рэзалюцыі змяшчаецца канкрэтны заклік да ўрадаў забяспечыць выкананне прынцыпу non-refoulement (прынцып невысылкі) у адпаведнасці з міжнародным правам. Па сутнасці, гэта азначае дадатковую гарантыю таго, што дзяржавы-сябры МАП не павінны адмаўляць у абароне беларускім прафсаюзным актывістам і сябрам незалежных прафсаюзаў.

---

101 *https://pace.coe.int/en/files/32899/html*

102 *Першай была М'янма, рашэнне па ёй было прынята ў 2000 г. у сувязі з масавай практыкай прымусовай працы.*

103 *Падрабязней аб працэсе ў МАП гл. матэрыял БХК: https://belhelcom.org/ru/news/33-statya-mot-v-otnoshenii-belarusi-poyasneniya-ot-belaruskogo-helsinkskogo-komiteta*

## ПРЫЗНАННЕ НА УЗРОЎНІ ЕС І САВЕТА ЕЎРОПЫ НЕАБХОДНАСЦІ ПРЫЦЯГНЕННЯ ДА ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ У СУВЯЗІ З ВАЙНОЙ ВА ЎКРАІНЕ ЛУКАШЭНКІ ДЫ ІНШЫХ ВЫШЭЙШЫХ СЛУЖБОВЫХ АСОБАЎ БЕЛАРУСІ

У пачатку года Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю аб стварэнні спецыяльнага міжнароднага крымінальнага трыбунала па агрэсіі ў дачыненні да Украіны. Згодна з тым, як апісана ў рэзалюцыі мадэль гэтага трыбунала, яго суб'ектную юрысдыкцыю мяркуецца распаўсюдзіць не толькі на Пуціна, але і на Лукашэнку.[104] Такая ж пазіцыя была пацверджана ў рэзалюцыі ПАСЕ.[105]

У красавіку ПАСЕ прыняла рэзалюцыю аб дэпартацыі і гвалтоўным перамяшчэнні дзяцей і іншых грамадзянскіх асобаў у Расію ці на іншыя акупаваныя ўкраінскія тэрыторыі.[106] Гэтая рэзалюцыя ўпершыню на афіцыйным узроўні прадэкларавала, што практыка дэпартацыі ўкраінскіх дзяцей з іх наступнай гвалтоўнай асіміляцыяй - форма генацыду паводле Канвенцыі аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго 1948 года. Апрача расійскіх службовых асоб у кантэксце прыцягнення да адказнасці за гэтае злачынства згадваецца і Лукашэнка.[107]

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG

104 *https://www.europarl.europa.eu/doceo/document/TA-9-2023-0015_EN.html*
105 *https://pace.coe.int/en/files/31620/html*
106 *https://pace.coe.int/en/files/31776/html*
107 *Гл. падрабязней юрыдычны разгляд такой магчымасці: https://www.ipg-journal.io/ru/regiony/evropa/lukashenko-i-deti-1750/*